Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
27 ЛЮТАГА 2018 г. АЎТОРАК № 40 (28656)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Маразы збіраюць ахвяры**
СТАР. 3



**Быў паручыцелем, стаў даўжніком**
СТАР. 4



**У пошуках слядоў Дуніна-Марцінкевіча**
СТАР. 8

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Больш як 5 тысяч**

*бязвізавых турыстаў наведалі Гродна з пачатку 2018 года, паведамілі ва ўпраўленні спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама. Нягледзячы на тое, што люты — далёка не самы актыўны ў плане турызму перыяд, адзначаецца станоўчая дынаміка, рост цікавасці замежнікаў да рэгіёна. Кожныя выхадныя ставяцца новыя рэкорды па колькасці бязвізавых турыстаў, якія наведалі горад. Калі ў студзені па суботах гэтая лічба складала каля 200—250 чалавек, то, напрыклад, у апошні ўік-энд іх прыехала звыш 400. У выхадныя едуць у асноўным арганізаваныя групы, а ў будні дні часцей горад наведваюць індывідуальныя турысты.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | -10° |
| Віцебск | - 14° |
| Гомель | - 11° |
| Гродна | -11° |
| Магілёў | - 14° |
| Мінск | - 11° |

ISSN 1990 - 763X

# У чатыры рукі



**Аліна ХАЛЯВІНСКАЯ — прызнаны майстар народнай творчасці са Стоўбцаў, усё жыццё працуе ў культуры па захаванні традыцыйных рамёстваў. І сама таксама працягвае самабытнае, менавіта стаўбцоўскае пляценне карзін з сасновай дранкі.**

**— Некалі ў Задвор'і, Белькаўшчыне, Шахноўшчыне і іншых вёсках нашага раёна цэлымі сем'ямі плялі карзіны — малыя і вялікія, квадратныя і прамавугольныя, на паўвядра, на вядро, а то і на два вядры, — кажа Аліна Антонаўна, удакладняючы стыль, шаблон і аб'ёмы карзін ў літрах. — Майстры сыходзяць, а рамяство трэба працягваць, перадаваць маладым.**

**Сям'я Халявінскіх таксама прычынілася да народнай творчасці. Старэйшы ўнук Аліны Антонаўны, 11-гадовы Мацвей ГАНЧАРОНАК *(на фота)*, ахвотна засвойвае ўрокі пляцення, самастойна падбірае неабходны матэрыял, і, галоўнае, мае залатую рысу характару — заўсёды імкнецца давесці пачатую справу да завяршэння.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Занятасць

## Якасныя кадры заўсёды ў трэндзе

### У наймальнікаў ёсць прэтэнзіі да прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў

**У Гродзенскай вобласці на пачатак года наймальнікі заявілі аб наяўнасці амаль 8 тысяч вакантных працоўных месцаў. З іх крыху больш за палову — для рабочых спецыяльнасцяў. Але ёсць высокая патрэба і ў служачых — ва ўрачах, інжынерах, педагогах і нават страхавых агентах. Праўда, запаўняць вакансіі няпроста — на рынку працы не хапае кампетэнтных спецыялістаў.**

**Сітуацыя стабілізуецца**

Сёлета на рынку працы рэгіёна чакаецца «пацяпленне». Гэта значыць, што асноўныя крокі па аптымізацыі ўжо зроблены. За два мінулыя гады толькі ў асноўным сектары эканомікі колькасць работнікаў знізілася на 22 тысячы чалавек. Зараз працягваецца стварэнне новых працоўных месцаў, і колькасць вакансій за мінулы год павялічылася ў паўтара раза. Адпаведна знізілася і колькасць беспрацоўных у рэгіёне. Гэта робіць рынак працы больш стабільным і гнуткім. Разам з тым большасць прадпрыемстваў чакаюць росту вытворчасці.

— Мы правялі апытанне сярод 208 асабліва значных прадпрыемстваў рэгіёна, дзе занята каля 20 % усіх працоўных вобласці, — адзначыў **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Сяргей МЯСНІКОЎ.** — Дзякуючы гэтым даследаванням, складзены прагноз тэндэнцый на рынку працы. У рэестры прадстаўлена 150 прафесій у розных сферах дзейнасці. Большая частка з іх уваходзіць у раздзел павышанага попыту.

СТАР. 4

## ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ДОБРУЮ КНІГУ?

**Юбілейная, XXV Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш распачнецца ўжо заўтра**

**Госці з 32 краін гэтымі днямі завітаюць у беларускую сталіцу, каб прыняць удзел у маштабным кніжным свяце. Азербайджан, Арменія, Вялікабрытанія, Германія, Грэцыя, Ізраіль, Латвія, Літва, Малдова, Пакістан... Літаратурныя навінкі з самых розных куткоў планеты з 28 лютага па 4 сакавіка будуць прадстаўлены ў выставачным павільёне па праспекце Пераможцаў, 14. Ганаровы госць сёлетняга кніжнага свята — Сербія.**

У праграме ўдзелу Ганаровага госця кніжнага кірмашу запланавана выстаўка Нацыянальнай бібліятэкі Сербіі «Сербская літаратура ў Першай сусветнай вайне». Пройдуць творчыя сустрэчы з вядомым сербскім празаікам Горанам Петравічам, Даянай Лазаравіч — перакладчыцай на сербскую мову зборніка Максіма Багдановіча «Вянок», а таксама сербска-беларуская літаратурная сустрэча «Творчы і навуковы тандэм: Іван Чарота і Драган Лакічавіч».

Будуць арганізаваны прэзентацыі выдадзенага ў Беларусі зборніка сучаснай сербскай паэзіі; кніг Невены Вітошавіч-Чэкліч «Чырвоныя кветкі Косава поля», кнігі «Беларусы пра Сербію і Югаславію»; падборкі беларускай паэзіі ў сербскім часопісе «Павелья» і сербскіх выпускаў часопісаў «Маладосць», «Полымя», «Нёман» і газеты «Літаратура і мастацтва». У Доме дружбы адбудзецца вечар, прысвечаны сербскай літаратуры.

Знакавым мерапрыемствам выстаўкі стане прэзентацыя «Энцыклапедыі Кітая» на беларускай мове. **Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў:

— Калі казаць пра кніжныя падарункі, якія будуць прадстаўлены на выстаўцы-кірмашы, то ў першую чаргу я хацеў бы назваць кнігі, звязаныя з мастацкім перакладам. Выпушчана ўнікальная анталогія «Паэты Кітая XX стагоддзя» на беларускай мове. Адбудуцца перамовы беларускіх кнігавыдаўцоў з кітайскімі калегамі — мяркуецца, што апошнія могуць прыйсці на беларускую пляцоўку, у тым ліку са сваімі электроннымі праектамі. Думаю, такое супрацоўніцтва прынясе плён. Тым больш што ўжо ў 2016—2017 гадах выдавецтва «Мастацкая літаратура» пачало асвойваць інвестыцыйныя праекты, звязаныя з прадстаўленнем кітайскай мастацкай кнігі на беларускай мове ў беларускай культурнай прасторы — часткова гэтыя выданні аплачаны Кітайскай Народнай Рэспублікай.

СТАР. 2

# Утрымліваем энергетычны баланс

## У дэпартаменце па энергаэфектыўнасці расказалі аб перспектыўных праектах да 2020 года

**Пачынаючы з 1997 года, спажыванне паліўна-энергетычных рэсурсаў (ПЭР) у краіне практычна не змянілася, а вось ВУП за гэты перыяд павялічыўся у 2,5 раза. Але і гэта не мяжа магчымасцяў, лічаць у дэпартаменце па энергаэфектыўнасці. Энергаёмістасць ВУП краіны сёлета плануецца знізіць яшчэ на 0,8 % да ўзроўню мінулага года. Пра гэта заявіў першы намеснік дырэктара дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар АКУШКА падчас пасяджэння калегіі ведамства, якая адбылася ў Мінску.**

А для гэтага неабходна сэканоміць каля 1 млн тон умоўнага паліва і дасягнуць долі мясцовых відаў паліва ў валавым спажыванні ПЭР не менш за 14,7 %.

«Што датычыцца долі аднаўляльных крыніц энергіі, то яны павінны скласці не менш за 6 %», — дадаў Віктар Акушка.

У 2018 годзе найбольшы аб'ём эканоміі энергетычных рэсурсаў плануецца забяспечыць за кошт укаранення ў вытворчасць сучасных энергаэфектыўных працэсаў і абсталявання. Акрамя таго, плануецца павысіць энергаэфектыўнасць існуючых тэхналогій.

Таксама Віктар Акушка нагадаў, што Беларусь дасягнула паказчыка энергаёмістасці развітых краін з падобнымі кліматычнымі ўмовамі, такіх як Канада і Фінляндыя. У Канадзе гэты паказчык складае 0,18, у Фінляндыі — 0,16.

Паводле апошніх вымярэнняў Міжнароднага энергетычнага агенцтва, якія праходзілі ў 2015 годзе, фактычны паказчык ВУП Беларусі склаў 0,16 тоны нафтавага эквіваленту на 1 тысячу долараў ВУП супраць 0,56 тоны нафтавага эквіваленту на 1 тысячу долараў ВУП у 1990 годзе. Фактычнае зніжэнне адбылося ў 3,5 раза. На працягу 25 гадоў аналагічны паказчык знізіўся ў Расіі ў 1,4 раза, ва Украіне — у 1,6 раза, у Казахстане — у 1,9 раза.

Паводле інфармацыі Белстата, за 11 месяцаў 2017 года паказчык зніжэння энергаёмістасці ВУП краіны склаў плюс 0,7 %. Негатыўны ўплыў на яго летась аказала павелічэнне спажывання светлых нафтапрадуктаў насельніцтвам і рост паліва-сыравіны на вытворчасць экспартнай няпаліўнай прадукцыі.

Па словах Віктара Акушкі, замежныя банкі выдзеляць Беларусі 200 млн долараў на развіццё энергаэфектыўных праектаў у перыяд з 2018 да 2020 года. Дэпартамент па энергаэфектыўнасці сумесна з іншымі зацікаўленымі ведамствамі і прадстаўніцтвам Сусветнага банка ў Беларусі рыхтуюць новы праект па стымуляванні выкарыстання мясцовых відаў паліва ў цеплазабеспячэнні. Праект з'яўляецца часткай рамачнай стратэгіі партнёрства з Беларуссю на 2018—2022 гады і мае на ўвазе новую схему фінансавання за кошт пазыковых сродкаў, часткі сродкаў з адлічэнняў на капітальны рамонт жылых будынкаў і часткі сродкаў з паступленняў ад прыватызацыі жылля.

«Магчымы сумарны аб'ём пазыковых сродкаў, якія прыцягваюцца, складае 200 млн долараў. З іх 100 млн долараў з'яўляюцца сродкамі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця, а астатнія рэсурсы — Еўрапейскага інвестыцыйнага банка», — растлумачыў Віктар Акушка. Паводле папярэдняй ацэнкі новы сумесны інвестыцыйны праект выгадны для Беларусі.

«Ацэнка мэтазгоднасці і магчымасці выкарыстання схемы фінансавання патрабуе належнага абгрунтавання для канчатковага адабрэння на ўзроўні ўрада і кіраўніка дзяржавы», — рэзюмаваў Віктар Акушка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ДОБРУЮ КНІГУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Міністр дадаў, што на гэтай выстаўцы вельмі хацелася б яшчэ больш замацаваць творчыя і прафесійныя стасункі з расійскімі выдавецтвамі. У прыватнасці, яго цешыць, што на юбілейную выстаўку чарговы раз завітае маскоўскае выдавецтва «Художественная литература» на чале з Георгіем Прахіным, вядомым рускім публіцыстам, пісьменнікам, грамадскім дзеячам. Безумоўна, будуць прадстаўлены іх новыя праекты, што маюць дачыненне да Беларусі.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

У сваю чаргу **начальнік гандлёвага аддзела ААТ «Белкніга» Святлана ГУК** таксама заўважыла, што падчас выстаўкі запланаваны перамовы з расійскімі калегамі — чакаецца падпісанне некаторых дамоў. Адбудзецца пастаўка кніг з Санкт-Пецярбурга ў межах умацавання сяброўскіх стасункаў з горадам на Няве.

У міжнародным сімпозіуме «Пісьменнік і час» будуць удзельнічаць пісьменнікі з 21 краіны. **Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ** адзначыў, што на выстаўцы ў Мінску будуць прадстаўлены ўсе абласныя пісьменніцкія суполкі гэтай арганізацыі — адбудуцца выступленні з чытаннем вершаў, выкананнем песень і інш.

Падчас сустрэчы з журналістамі, якая адбывалася ў Нацыянальным прэс-цэнтры Беларусі, гаварылася і пра тое, што вялікая ўвага на гэтай выстаўцы будзе звернута на літаратурную дзейнасць у рэгіёнах. Натуральна, не застанецца па-за ўвагай арганізатараў і ўдзельнікаў і 500-годдзе айчыннага кнігадрукавання, якое краіна шырока адзначала летась.

Сярод цікавых навінак айчыннага кнігавыдання, якія будуць прадстаўлены на выстаўцы, кніга публіцыстычкі прафесара Адама Мальдзіса, якая нядаўна пабачыла свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці». Відавочна, што знойдзе свайго чытача і першы том персанальнай энцыклапедыі «Янка Купала», які быў выпушчаны ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».

— Я з'яўляюся выканаўчым дырэктарам усіх 25 кніжных выставак-кірмашоў, — адзначыў **генеральны дырэктар ПК ТАА «Макбел» Дзмітрый МАКАРАЎ**. — Спадзяюся, што сёлета моцныя маразы не зашкодзяць нам сабраць традыцыйна вялікую колькасць наведвальнікаў выстаўкі. Чакаем усіх ахвотных на працягу пяці дзён. Аднак тым, хто хоча набыць болей кніг, раім прыходзіць раней. Дарэчы, нягледзячы на вопыт замежных калег, уваход на Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш застанецца вольным.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# ДЛЯ ШЧАСЛІВАГА МАЦЯРЫНСТВА

**Інфармацыйна-асветніцкая акцыя рэспубліканскага кангрэса «Мама Pro» адбылася ў мінулыя выхадныя ў Брэсце. Для ўдзелу ў мерапрыемстве зарэгістравалася каля 400 чалавек. У грамадска-культурны цэнтр прыйшлі ў асноўным маладыя мамы і таты, а таксама тыя, хто плануе стаць бацькамі.**

Як правільна спланаваць нараджэнне дзіцяці, ці варта ісці на партнёрскія роды, якія прадукты трэба ўжываць будучай маме альбо як дасягнуць псіхалагічнага камфорту мужу і жонцы падчас цяжарнасці? Прагучала яшчэ шмат пытанняў і адказаў на іх. Парады ўдзельнікам мерапрыемства давалі як сталічныя ўрачы, так і дактары з Брэста. Выступалі педыятр і дзіцячы стаматолаг. На мерапрыемства прыйшлі таксама вытворцы дзіцячых тавараў.

Асноўнай мэтай праекта «Мама Pro», паводле слоў яго кіраўніка, урача Дзіяны Мардас, заяўлена паляпшэнне камунікацый у сістэме «ўрач-пацыент», павышэнне рэпрадукцыйнай пісьменнасці насельніцтва, прасоўванне сямейных каштоўнасцяў і шчаслівага мацярынства. У гэту формулу ўпісваецца і паведамленне галоўнага акушэра-гінеколага Міністэрства аховы здароўя Юліі Савачкінай аб тым, што неўзабаве стане магчыма наведваць маладых маці ва ўсіх радзільных дамах непасрэдна ў палаце. Гэта паспрыяе як псіхалагічнаму камфорту маладой матулі, так і даверу паміж бацькамі і доктарам.

Менавіта на карысць даверу і камфорту патэнцыяльных парадзіх пайшло наступнае за кангрэсам мерапрыемства, што адбылося ў нядзелю ў Брэсцкім абласным радзільным доме. Тут зладзілі дзень адчыненых дзвярэй для жанчын з тэрмінам цяжарнасці больш за 30 тыдняў. Будучыя мамы прайшлі па тым шляху, які іх неўзабаве чакае: ад прыёмнага аддзялення церазперадродавую палату, радзільную залу і да пакоя выпіскі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# АДДЗЯЛЯЦЬ ФАКТЫ АД ВЫДУМКІ

**У Інстытуце журналістыкі БДУ на базе кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры адбылася сёмая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Міжнародная журналістыка 2018: глабальныя выклікі, рэгіянальнае партнёрства і медыя».**

Яе ўдзельнікамі, акрамя беларускіх навукоўцаў і практыкаў, сталі прадстаўнікі ўніверсітэцкай і акадэмічнай навукі з Расіі, Украіны, Польшчы, Малдовы. У ходзе абмеркавання такіх актуальных тэматычных напрамкаў, як асабліваці асвятлення інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы, спецыфіка медыйнага забеспячэння беларуска-кітайскага стратэгічнага партнёрства, у прыватнасці рэалізацыі праекта эканамічнага пояса Шаўковага шляху, былі разгледжаны тэндэнцыі сучаснай журналістыкі Беларусі, Расіі, Украіны, Кітая і іншых краін. Вынікамі сваіх навуковых даследаванняў падзяліліся на канферэнцыі вучоныя ўніверсітэтаў Масквы, Санкт-Пецярбурга, Краснаярска, Ніжняга Ноўгарада, Белгарада, Калугі, Казані, Саранска, Беластока, Кіева, Львова, Цірасполя.

Вялікую цікавасць і шмат пытанняў выклікала выступленне госці з ЗША Барбары МакКормак, віцэ-прэзідэнта па адукацыйных праграмах музея журналістыкі і навін (Newseum), што ў Вашынгтоне. Яе даклад быў прысвечаны вельмі актуальнай цяпер тэме барацьбы з так званымі «фэйкавымі» навінамі. На радзіме Барбара — вядомы і запатрабаваны спецыяліст у сферы стварэння адукацыйных рэсурсаў і праграм па павышэнні медыяадукаванасці насельніцтва. Адной з важных мэт гэтай працы з'яўляецца навучанне ўменню распазнання лжывых або, як сёння прынята казаць, «фэйкавых» навін, якіх нямала сярод паведамленняў у розных СМІ, найперш — у інтэрнэт-прасторы...

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ШЧУПАК СТАНОВІЦЦА «ДАРАГІМ»

**З 1 сакавіка ў большасці рэгіёнаў Беларусі (за выключэннем Віцебшчыны) уводзіцца забарона на лоўлю шчупака, якая будзе доўжыцца па 15 красавіка (у Віцебскай вобласці забарона дзейнічае з 9 сакавіка па 25 красавіка).**

Ахоўныя меры звязаны з пачаткам нерасту ў гэтага віду. Шчупак ідзе на яго раней за іншых вясенне-нерастуючых рыб, паколькі не такі патрабавальны да прагрэву вады. Прэснаводны драпежнік вельмі важны для балансу іхтыяфауны — ён з'яўляецца свайго роду рэгулятарам рыбнага насельніцтва. Знішчэнне шчупаком малакаштоўнай драбязы, хворых і аслабленых рыб садзейнічае лепшаму росту каштоўных відаў і аздараўленню папуляцый.

Летась у беларускія вадаёмы было ўселена 3,2 мільёна экзэмпляраў маладняку шчупака — больш, чым якога іншага віду. Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, вылаў гэтай рыбы падчас нераставай забароны цягне сур'ёзную адказнасць: адміністрацыйную ў выглядзе штрафу да 50 базавых велічынь або крымінальную, калі нанесеная шкода складае 100 і больш базавых велічынь. Сума шкоды ў перыяд забароны вылічваецца з разліку 9 базавых велічынь (220,5 рубля) за адну асобіну шчупака.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПЛЕНУМ ЦК КАМПАРТЫІ КІТАЯ ПРЫСТУПІЎ ДА РАЗГЛЯДУ ПАПРАВАК ДА КАНСТЫТУЦЫІ КНР

Напярэдадні былі апублікаваныя прапанаваныя ЦК КПК праекты папраўак у асноўны закон краіны: кіраўніцтва партыі выступіла з ініцыятывай выключыць з канстытуцыі палажэнне аб тым, што старшыня і віцэ-старшыня КНР могуць «займаць пасаду не больш за два тэрміны запар». Калі такія заканадаўчыя змены будуць зацверджаны на сесіі УСНП, гэта дазволіць старшыні КНР Сі Цзіньпіну пераабрацца на новы, трэці тэрмін у 2023 годзе.

Таксама ЦК КПК прапанаваў уключыць у асноўны закон тэарэтычныя палажэнні Сі Цзіньпіна аб новай эпосе развіцця сацыялізму з кітайскай спецыфікай. Партыйнае кіраўніцтва таксама прапанавала стварэнне і ўнясенне ў канстытуцыю новага органа — Дзяржаўнага наглядчага камітэта. Сярод іншых праектаў папраўак — унясенне ў асноўны закон палажэння аб працэдуры прынесення прысягі на вернасць канстытуцыі: такую клятву павінны будуць публічна даваць усе дзяржаўныя служачыя перад уступленнем на пасаду.

## УЛАДЫ ІЕРУСАЛІМА ПЛАНУЮЦЬ СПАГНАЦЬ З ЦЭРКВАЎ 180 МЛН ДОЛАРАЎ ПАДАТКАЎ

Муніцыпалітэт Іерусаліма плануе спагнаць з хрысціянскіх канфесій больш за 180 млн долараў у якасці падаткаў з іх нерухомасці, размешчанай у горадзе. Пра гэта заявіў мэр Нір Баркат, перадае РІА «Навіны».

«Даўгі за камерцыйныя плошчы, якія належаць цэрквам, перавышаюць 650 млн шэкеляў. Мы больш не будзем патрабаваць ад жыхароў Іерусаліма несці гэты цяжар і субсідаваць гэты каласальны доўг», — гаворыцца ў заяве мэра.



Улады запатрабавалі ад хрысціянскіх канфесій плаціць муніцыпальныя падаткі з усёй нерухомасці, акрамя непасрэдна цэркваў, і ўжо прыступілі да арыштаў рахункаў. У мэрыі дадалі, што ў «Іерусаліме ўсе роўныя перад законам — хрысціяне, мусульмане і іўдзеі». Раней паведамлялася, што храм Гроба Гасподняга было вырашана часова закрыць у знак пратэсту супраць новых падаткаў.

## БРЫТАНСКІ АСТРАНАЎТ НАЗВАЎ ТЭРМІНЫ ВЫСАДКІ ЗЯМЛЯН НА МАРС

Брытанскі астранаўт Цім Пік заявіў, што жыхары Зямлі высадзяцца на Марс прыкладна праз 20 гадоў. Пра гэта паведамляе Independent.

Пік падкрэсліў, што нядаўні ўдалы запуск Falcon Heavy кампаніяй SpaceX з'яўляецца «вельмі, вельмі натхняльным». «Людзі на Марсе? Мяркую, гэта будзе ў канцы 2030-х. Гэта тое, над чым працуюць дзяржаўныя касмічныя ведамствы і Міжнародная група па даследаванні космасу», — сказаў астранаўт.

Пры гэтым, паводле яго слоў, камерцыйныя праекты ў духу ініцыятыў Ілана Маска могуць наблізіць гэтую падзею. Раней Маск заявіў аб планах пачаць каланізацыю Марса ў 2022 годзе.

ОАО «Шершуны-Агро» Минского района
на постоянную работу требуются:

- Оператор по искусственному осеменению животных
- Зоотехник
- Начальник молочно-товарного комплекса

Требования: опыт работы. Жилье предоставляется
Телефон для справок 8044-578-17-11

УНП 690654548

■ Стыхія

# Маразы збіраюць ахвяры

**Моцныя маразы стаяць у Беларусі ад мінулага чацвярга. За гэты час ртутны слупок падаў ажно да амаль 30 градусаў са знакам «мінус». Разам з тым стала больш і пажараў. Калі за апошнія два працоўныя дні іх адбылося 46 з пяццю загінулымі, то за выхадныя лік узгаранняў узляцеў ужо да 73 з 11 смярцямі!**



Зразумела, што ў такое надвор'е сістэма ацяплення дома павінна працаваць без збояў. Але як жа правільна паліць печ?

— Яе неабходна распальваць некалькі разоў на дзень з перапынкамі, — расказвае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Віталь НАВІЦКІ.** — Бесперапыннае паленне можа прывесці да перагарту печы і з'яўлення расколін. У сваю чаргу, гэта выкліча пажар. Не выкарыстоўвайце для распальвання агню лёгкія на загаранне і гаручыя вадкасці. Пары ўспыхнуць, і чалавек, які стаіць побач з печчу, атрымае цяжкія апёкі. Калі ж сістэма ацяплення замерзла, то адагрэйце яе гарачым пяском, вадой. Выкарыстанне адкрытай крыніцы агню — напрыклад паяльнай лямпы — можа прывесці да пажару.

Небяспека падсцерагае і на адкрытым паветры. Зарабіць у такое надвор'е абмаражэнне зусім няцяжка. Справа можа дайсці і да ампутацыі канечнасці.

— Цяжкія абмаражэнні нярэдка адбываюцца ў людзей у стане моцнага алкагольнага ап'янення, — працягвае Віталь Навіцкі. — Тытунёвы дым паніжае перыферыйную цыркуляцыю крыві, што адбіваецца на руках і нагах. Цесны абутак таксама можа паспрыяць абмаражэнню. Пярсцёнкі і завушніцы пакіньце дома — метал настывае вельмі хутка і можа «прыстаць» да цела. Як толькі вы адчулі, што канечнасці пахаладзелі, — тэрмінова зайдзіце ў якое-небудзь цёплае месца. А калі заглух аўтамабіль далёка ад цывілізацыі, то выклікайце дапамогу і не пакідайце салон. Што да ўзросту, то ў групе рызыкі — дзеці і пажылыя людзі. Калі ж вы ўсё-такі выпусцілі малога ў мароз на вуліцу, то яму трэба праз 15—20 хвілін вяртацца ў цяпло.

* * *

Тым часам сумная вестка прыйшла з Гродзеншчыны. У ноч на панядзелак у вёсцы Неўда Навагрудскага раёна загарэўся жылы дом. Ратавальнікі, якія выбылі на месца падзей, адправіліся ў дом на пошукі жанчыны, якая там, па словах відавочцаў, магла знаходзіцца. І ў той час, калі звяно газадымаабарончай службы знаходзілася ўнутры будынка, абрынуліся перакрыцці і комін печы. Будаўнічыя канструкцыі заціснулі камандзіра аддзялення старшага прапаршчыка Дзмітрыя Зайко. Яго неадкладна выцягнулі з-пад завалаў і тэрмінова адвезлі ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы. Але раніцай ратавальнік памёр...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

❍ У ТЭМУ

### Сібірскі мароз выкліканы стратасферным пацяпленнем

**Халады, якія ўстанавіліся напярэдадні вясны на значнай частцы Еўропы, — з'ява рэдкая, але не беспрэцэдэнтная. Пра гэта заявіла на брыфінгу ў Жэневе афіцыйны прадстаўнік Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) Клэр Нюліс.**

Пахаладанне ў Еўропе абумоўлена феноменам раптоўнага стратасфернага пацяплення прыкладна за 30 кіламетраў над Паўночным полюсам. Рэзкае і хуткае павышэнне тэмпературы прыводзіць да спынення звычайных для гэтага часу заходніх вятроў, на змену якім прыходзяць усходнія: нясуць у Еўропу сібірскі холад. Клэр Нюліс звярнула ўвагу на прагноз рэгіянальнага цэнтра СМА па маніторынгу клімату ў Германіі, згодна з якім з 20 лютага наступіў перыяд з тэмпературамі істотна ніжэйшымі за нармальныя, і працягнецца ён на большай частцы Еўропы як мінімум 2—3 тыдні. На еўрапейскай частцы Расіі, у Беларусі, Польшчы і Украіне слупок тэрмометра апусціцца ніжэй за мінус 10 градусаў Цэльсія. У Цэнтральнай Еўропе, на поўначы Італіі, на Балканах і ў краінах Балтыі тэмпература будзе «анамальная» — ніжэй за мінус 6 градусаў.

На поўдні Еўропы метэаролагі абяцаюць маразы, папярэджваючы аб пагібельных для сельскай гаспадаркі замаразках на глебе і пра рызыкі для ўразлівых людзей з-за ўздзеяння холаду. У той жа час у шэрагу раёнаў Арктыкі зараз назіраецца высокія тэмпературы. З 16 лютага тут некалькі разоў была зафіксавана тэмпература вышэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Холад пакуль не адпусціць

### У першыя дні вясны маразы ўначы будуць дасягаць мінус 20 градусаў

**А пакуль зіма не здае сваіх пазіцый, і ў апошнія дні лютага захаваецца вельмі халоднае надвор'е. Разам з пачаткам каляндарнай вясны, маразы крыху аслабеюць, пойдзе снег, але казаць аб прыходзе цеплыні яшчэ не даводзіцца. У пачатку сакавіка захаваецца зімовы характар надвор'я са снегам і маразамі, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўмовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць перыферыя халоднага антыцыклону з цэнтрам над Скандынавіяй. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, у асобных раёнах краіны пройдзе невялікі снег. Тэмпература паветра ўдзень прагназуецца ад мінус 9 да мінус 15 градусаў. А вось у сераду тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з Украіны. Таму ўначы, пераважна па паўднёва-ўсходняй частцы, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдзе снег. У асобных раёнах ён будзе суправаджацца парывістым ветрам і завеяй. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 13 градусаў па поўначы да мінус 23 градусаў па поўдні краіны. Удзень чакаецца ад мінус 9 градусаў да 15 марозу.

У першы дзень вясны (чацвер) атмасферныя франты абумовяць у многіх раёнах снег, па паўднёва-ўсходняй частцы краіны — прайцглы снег. Месцамі чакаецца завіруха. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 13 да мінус 19 градусаў, па поўдні маразы аслабеюць — там будзе ад мінус 11 да мінус 12 градусаў. Удзень чакаецца ў межах ад мінус 7 да мінус 12 градусаў. У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 10—16 градусаў, месцамі пры праясненнях паветра астудзіцца да мінус 17 — мінус 20 градусаў. Удзень будзе ад мінус 5 да мінус 11 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

■ На слыху

### ТРАГІЧНЫ МУЖЧЫНСКІ ДЗЕНЬ

**Маладыя людзі сабраліся ў гаражна-будаўнічым кааператыве на ўскраіне Гомеля, каб адзначыць свята. Цяпер гэты намер стаў падставай для праверкі па факце смерці траіх 20-гадовых мужчын, якую праводзіць Гомельскі гарадскі аддзел Следчага камітэта.**

Папярэдне ўстаноўлена, што вечарам 23 лютага кампанія маладых мужчын у гаражы распівала спіртныя напоі. Як расказала афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя Крыванагава, некалькі чалавек пайшлі дадому, а чацвёра засталіся ў гаражы. Пры гэтым дзверы ў памяшканне зачынілі знутры. Каб сагрэцца, маладыя людзі селі ў аўтамабіль, які знаходзіўся ў гаражы, і завялі рухавік.

У суботу маладыя людзі перасталі адказваць на тэлефонныя званкі, пазней іх знайшла ў гаражы сястра аднаго з мужчын. Супрацоўнікі хуткай медыцынскай дапамогі, якія прыбылі на месца здарэння, канстатавалі смерць трох чалавек. Яшчэ аднаго — 19-гадовага хлопца ў стане непрытомнасці шпіталізавалі. Па папярэдніх высновах экспертаў, маладыя людзі памерлі ад атручвання чадным газам. Для ўстанаўлення дакладнай прычыны смерці прызначаны судова-медыцынскія экспертызы. Супрацоўнікі следчага камітэта высвятляюць падрабязнасці трагедыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ПАВЫХОЎВАЛА?

Ці заўважалі вы, якія падобныя здарэнні разам з наступствамі адзначаюцца апошнім часам у міліцэйскіх зводках? Спачатку сядзелі і выпівалі два сабутэльнікі, потым пасварыліся, пабіліся. Вынік — адзін, а то і абодва аказаліся ў бальніцы. І ўсё часцей фігурантамі ўказанай, зусім не тэатральнай дзеі выступаюць мужчына і жанчына, а іх сумесная выпіўка заканчвaецца зусім не сцэнай кахання...

Вось і 50-гадовая жыхарка Баранавіч запрасіла ў госці на чатыры гады маладзейшага вяскоўца. Пасядзелі, выпілі... Потым, як вынікае з матэрыялаў справы, небараку даставілі ў бальніцу з страсеннем мазгоў, пераломамі рэбраў і нават пашкоджаннем лёгкага. У парыве гневу дама так адпушчавала кавалера металічнай табурэткай, што апошні ледзьве жывы застаўся. Дарэчы, абое не працуюць. Застаецца адкрытым пытанне: за што білі? А мэбля, якую забралі як рэчавы доказ, відаць, дасталася гаспадыні кватэры ў спадчыну.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ЧАМУ Ў ГАНДЛЁВЫМ ЦЭНТРЫ ПАМЕРЛА ДЗЯЎЧЫНА?

**Следчыя высвятляюць акалічнасці смерці 28-гадовай дзяўчыны ў гандлёвым цэнтры ў Мінску. 24 лютага каля 17.30 у «Дана Мол» па вуліцы П. Мсціслаўца яна адчула сябе дрэнна...**

Дзяўчына паведаміла пра гэта па тэлефоне свайму знаёмаму, які выклікаў ёй таксі. Кіроўца суправадзіў дзяўчыну ў аптэку, дзе яе самаадчуванне рэзка пагоршылася. Супрацоўнікі аптэкі і хуткай дапамогі праводзілі рэанімацыйныя мерапрыемствы, аднак выратаваць яе не ўдалося.

Першамайскім (горада Мінска) раённым аддзелам Следчага камітэта па гэтым факце праводзіцца праверка. З мэтай высвятлення абставін таго, што здарылася, вывучаюцца відэазапісы камер назірання ГЦ, апытваюцца відавочцы і блізкія дзяўчыны. Для ўстанаўлення дакладнай прычыны смерці прызначана судова-медыцынская экспертыза.

Адміністрацыя «Дана Мол» выключыла магчымасць траўміравання дзяўчыны на тэрыторыі гандлёвага цэнтра.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ЗАТРЫМАНЫ ПА ПАДАЗРЭННІ Ў ЗАБОЙСТВЕ

Два тыдні таму раённы Кобрын літаральна скалыхнула навіна аб трагедыі. На мужа і жонку напаў невядомы з нажом. Зламыснік нанёс множныя траўмы абаім. У выніку цяжарная 31-гадовая жанчына, грамадзянка Украіны, памерла. Яе муж быў дастаўлены ў рэанімацыю. Ён, дарэчы, і зараз праходзіць лячэнне.

Злачынца з месца здарэння ўцёк. А днямі праваахоўнікі затрымалі навучэнца адной з кобрынскіх сярэдніх спецыяльных устаноў, жыхара Пінска, па падазрэнні ў тым нападзе. Хлопцу ўсяго 19 гадоў. Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік УУС Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Дучэнка, зараз з падазраваным працуюць спецыялісты. Абставіны і матыў злачынства высвятляюцца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ** ■

■ Народныя традыцыі

## УЛАССЕ: КАРОВІНА ДЫ КОНСКАЕ СВЯТА

**Адзначаецца яно напрыканцы лютага. У гэты дзень скаціну кармілі самым лепшым кормам і нават частавалі печывам у форме падкоўкі альбо капытца, на якое клалі кавалак масла. Таму пра свята яшчэ казалі «На Аўласа бяры каўшом масла». Добра ведаюць пра традыцыі Уласся ў аграгарадку Лукі Карэліцкага раёна, дзе на выхадных зладзілі тэматычны фэст.**



Даўней Улассе як унікальны абрад праводзілі менавіта ў Луках, таму ў гэтым мястэчку і сталі адраджаць яго.

— На свята вяскоўцы на конях аб'язджалі вакол сяла, каб хатняя жывёла была здаровая і стаўся добры ўраджай. Абавязкова завітвалі цыгане, якіх раней шмат жыло ў Луках, — расказала **Наталля ГАРОДНІК, дырэктар Карэліцкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці.** — Таму на нашым свяце таксама прысутнічаў табар з мядзведзем.

У аграгарадку традыцыйны аб'езд вакол вёскі рабілі ажно на трох упрыгожаных вазах, на якіх з задавальненнем праехалася і дзетвара. Мужчыны на свяце мераліся сілай: перацягвалі канат ды ўзнімалі гіры. Жанчыны гадалі ў цыганак і танчылі пад песні ды гранне артыстаў з аграгарадка Жухавічы ды народнага тэатра «Студыя гульні «Прымакі» з суседняга Дзятлаўскага раёна. Дзятва — проста весялілася на ўсю моц. І вядома, усе частаваліся смачнымі «падкоўкамі» ды блінамі.

Холад не толькі не сапсаваў настрой гасцям свята, але і наадварот абнадзеіў, бо ўласаўскія маразы лічыліся апошнімі ўзімку. У народзе казалі: «Пральле Улас масліца на дарогі — зіме час прымаць ногі».

**Ірына СІДАРОК.**

■ Разумныя грошы

# КАБ НЕ ПЛАЦІЦЬ ЗА ЧУЖЫЯ ДАЎГІ



## Выйсці з катэгорыі паручыцеляў выключна па сваім жаданні нельга

**Быў у маім жыцці адзін сумны выпадак. Даўно быў. Стаў я тады паручыцелем. Асноўным паручыцелем на досыць вялікую суму грошай. Знаёмы мой тады добрую кватэру пабудаваў. Дарагую мэблю купіў. Потым перацягваў яе, надарваўся і памёр. Аказваецца, у яго «спячая» хвароба была, пры якой цяжкае падымаць не рэкамендуецца... Пазыкі і крэдыт потым аддавалі яго бацькі, а магло б быць усё інакш. Для асноўнага паручыцеля, маю на ўвазе. Дарэчы, многія і сёння, пагаджаючыся на гэта, як мінімум вельмі рызыкуюць...**

### САЛІДАРНАЯ АБО СУБСІДЫЯРНАЯ

Каб паменшыць колькасць фінансавых непаразуменняў і павысіць фінансавую адукаванасць нашых людзей, асацыяцыя беларускіх банкаў падрыхтавала памятку паручыцеля.

Што такое паручыцельства па крэдыце? Гэта пісьмовае пацвярджэнне таго, што чалавек возьме на сябе поўную адказнасць па выкананні крэдытнага дагавора, калі гэта не зможа зрабіць той, за каго ён паручаецца. Дагавор заключаецца паміж банкам і паручыцелем.

У выпадку, калі вам прапанавалі выступіць паручыцелем па крэдыце, трэба ўлічваць, што паручыцель нясе салідарную з атрымальнікам крэдыту адказнасць па крэдытным дагаворы, калі заканадаўствам або дагаворам паручыцельства не прадугледжана субсідыярная адказнасць.

Калі крэдытаатрымальнік не ўнёс чарговы плацеж па крэдыце, то гэта павінен зрабіць паручыцель. Гэта значыць банк мае права патрабаваць пагашэння абавязацельстваў па крэдыце адразу з паручыцеля, нават не прад'яўляючы спачатку патрабаванне крэдытаатрымальніку, альбо адначасова прад'явіць патрабаванне крэдытаатрымальніку і паручыцелю. Гэта салідарная адказнасць.

Субсідыярная адказнасць азначае, што да прад'яўлення патрабавання паручыцелю банк павінен прад'явіць патрабаванне крэдытаатрымальніку. Толькі ў тым выпадку, калі крэдытаатрымальнік адмовіўся ці не ў стане цалкам або часткова задаволіць патрабаванні банка або банк не атрымаў ад яго адказу ў належны час, гэта патрабаванне можа быць прад'яўлена паручыцелю.

Паручыцель адказвае перад банкам у тым жа аб'ёме, што і крэдытаатрымальнік: па асноўнай суме доўгу, працэнтах, няўстойцы (штрафах, пені), кампенсацыі выдаткаў па спагнанні доўгу і іншых страт банка, выкліканых невыкананнем або неналежным выкананнем абавязацельстваў крэдытаатрымальнікам.

Таму адкажыце спачатку самому сабе: ці сапраўды зможаце паручыцца за чалавека, які вас аб гэтым просіць. Ацаніце, якую суму сродкаў вы рэальна можаце накіраваць на пагашэнне абавязацельстваў крэдытаатрымальніка, калі з тым штосьці здарыцца.

### ДАВЕДАЦЦА ЎСЮ ПАДНАГОТНУЮ

Уважліва вывучыце ўсю інфармацыю аб крэдытаатрымальніку, а таксама ўмовы карыстання і вяртання крэдыту, па якім вы збіраецеся выступіць паручыцелем. Высветліце, ці ёсць у яго запазычанасць па раней атрыманых крэдытах, пазыках і іншых абавязацельствах. Калі была і ёсць у цяперашні час пратэрмінаваная запазычанасць па пагашэнні крэдыту, задайце сабе пытанне: «Ці гатовы я паручыцца за такога крэдытаатрымальніка?».

Па інфармацыю аб наяўнасці ў патэнцыйнага крэдытаатрымальніка, за якога вы хочаце паручыцца, запазычанасці па раней атрыманых крэдытах, пазыках і іншых абавязацельствах (такая інфармацыя змяшчаецца ў крэдытных справаздачах) вы можаце звярнуцца ў Крэдытны рэгістр Нацыянальнага банка. З умовамі атрымання крэдытных справаздач можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Нацыянальнага банка www.nbrb.by ў раздзеле «Пытанні, якія часта задаюцца».

Крэдытная справаздача можа быць атрымана толькі са згоды асобы, інфармацыя аб якой выдаецца. Згода афармляецца ў прысутнасці ўпаўнаважанага супрацоўніка Нацбанка. Крэдытаатрымальнік можа самастойна звярнуцца ў крэдытны рэгістр з мэтай атрымання сваёй крэдытнай справаздачы і даць яе паручыцелю для азнаямлення.

### НЕ САРОМЕЙЦЕСЯ ПЫТАЦЬ

Не спяшайцеся падпісваць дакументы. Перад падпісаннем дагавора паручыцельства старанна вывучыце яго. Па магчымасці вазьміце дагавор паручыцельства і крэдытны дагавор, па якім вы паручаецеся, дадому. Больш уважліва вывучыце іх умовы, якія ўстанаўліваюць вашы абавязкі (абавязацельствы, адказнасць), пераканайцеся, што дагавор не змяшчае ўмоў, аб якіх вам не вядома ці сэнс якіх не ясны.

Калі якія-небудзь умовы дагавора не зразумелыя, прасіце супрацоўнікаў банка і асобу, за якую вы паручаецеся, растлумачыць іх вам і пацвердзіць, па магчымасці, адпаведнымі дакументамі. Не саромейцеся пытаць, удакладняць тыя пытанні, якія вам не зразумелыя.

Майце на ўвазе, што ваша адказнасць можа быць абмежавана дагаворам паручыцельства: напрыклад, канкрэтнай сумай або канкрэтным відам абавязацельстваў, у межах якіх вы прымаеце на сябе абавязацельствы адказваць за крэдаатрымальніка. Вы можаце таксама прадугледзець у дагаворы паручыцельства субсідыярны характар сваёй адказнасці. Аднак варта ўлічваць, што ўмовы паручыцельства, як правіла, прапануе банк, які дае крэдыт, і вам давядзецца ўзгадніць прапанаваныя вамі змены ўмоў адказнасці па дагаворы паручыцельства. Перад тым як паставіць свой подпіс, яшчэ раз узважце ўсе «за» і «супраць» падпісання дагавора паручыцельства, спакойна ацаніце свае магчымасці па выкананні абавязацельстваў па крэдытным дагаворы, па якім вы паручаецеся. Падпісвайце дагавор паручыцельства толькі ў тым выпадку, калі вы ўпэўнены, што ўсе яго ўмовы зразумелыя. Вы дакладна ўяўляеце, якія абавязацельствы на сябе прымаеце і дакладна ведаеце, што гатовыя і здольныя іх выканаць.

### КАЛІ ПАРУЧЫЦЕЛЬСТВА ЛІЧЫЦЬ СПЫНЕНЫМ

Памятайце: падпісаўшы дагавор паручыцельства, кліент згаджаецца з усімі яго ўмовамі і прымае на сябе абавязацельствы па іх выкананні, у тым ліку па выкананні абавязацельстваў па крэдытным дагаворы асобы, за якую ён паручыўся. Звярніце ўвагу! Калі крэдытаатрымальнік і банк змяняюць умовы крэдытнага дагавора такім чынам, што гэта цягне за сабой павелічэнне вашых абавязацельстваў ці іншыя неспрыяльныя наступствы для вас (павелічэнне сумы асноўнага доўгу, працэнтнай стаўкі за карыстанне крэдытам, змяненне тэрмінаў крэдытавання і іншае) і пры гэтым на такія змены не атрымана ваша згода, паручыцельства лічыцца спыненым.

Да паручыцеля, які выканаў абавязацельствы, пераходзяць правы крэдытора ў тым аб'ёме, у якім ён задаволіў патрабаванне крэдытора. Гэта азначае, што паручыцель мае права патрабаваць ад крэдытаатрымальніка выплаты сумы па асноўным доўгу, якую ён выплаціў банку, выплаты працэнтаў, налічаных на выплачаную суму, кампенсацыі іншых страт у сувязі з выкананнем абавязацельстваў за крэдытаатрымальніка (за выключэннем сум, выплачаных паручыцелем у сувязі з невыкананнем сваіх абавязацельстваў у адпаведнасці з дагаворам паручыцельства).

### УСЁ ГЭТА КРЭДЫТНАЯ ГІСТОРЫЯ

Паручыцель набывае правы банка як залогатрымальніка, калі выкананне абавязацельстваў па вяртанні крэдыту было забяспечана залогам. У мэтах забеспячэння вашых правоў як паручыцеля, які выканаў абавязацельствы, банк абавязаны ўручыць кліенту дакументы, якія сведчаць патрабаванне да крэдытаатрымальніка, і перадаць правы, якія забяспечваюць гэтае патрабаванне.

Улічвайце, што інфармацыя аб вашых абавязацельствах па крэдытным дагаворы ў якасці паручыцеля будзе перададзена банкам у Крэдытны рэгістр Нацыянальнага банка краіны для фарміравання вашай крэдытнай гісторыі.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Якасныя кадры заўсёды ў трэндзе

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вялікі шанц знайсці работу маюць медыцынскія сёстры, фельчары, фармацэўты, леснікі, аграномы, зваршчыкі, вадзіцелі, трактарысты, афіцыянты, кандытары і іншыя. Не такія шырокія магчымасці ў дызайнераў, мадэльераў, псіхолагаў, архітэктараў, маляроў і наладчыкаў абсталявання. І зусім мала шанцаў знайсці працу ў станочнікаў, тэхнікаў-праграмістаў і рэкламных агентаў.

### Патрэбны кампетэнтныя кадры

Найбольш дынамічнае равіццё рынку працы чакаецца ў прамысловасці. Па прагнозах, тут будзе створана больш за палову ўсіх новых працоўных месцаў. Разам з тым наймальнікі адзначаюць недахоп кваліфікаваных рабочых. Таму большасць працоўных месцаў створаць для высокакваліфікаваных спецыялістаў, а некампетэнтных рабочых будуць звальняць. Захаваецца попыт на тэхнічных спецыялістаў і кіраўнікоў сярэдняга звяна на вытворчасці.

Хоць эканоміка рэгіёна арыентавана на аграрны сектар (тут працуе 13 % эканамічна актыўнага насельніцтва), аднак сітуацыя з кадрамі па-ранейшаму складаная. Многія гаспадаркі маюць сур'ёзную патрэбу ў такіх спецыялістах, як заатэхнік, ветэрынар, інжынер і іншыя.

Сёлета вырасце патрэба ў будаўнічых кадрах. Гэта звязана з павелічэннем вытворчых планаў. Падчас крызісу значная частка работнікаў пакінула будаўнічую галіну, зараз арганізацыі імкнуцца вярнуць былыя пазіцыі. Менавіта сюды патрэбны амаль усе будаўнічыя спецыяльнасці.

Па прагнозах, сёлета больш за палову прадпрыемстваў гандлю спадзяюцца на рост продажаў, таму і попыт на прадаўцоў застанецца высокі. Гэтыя працоўныя месцы ў асноўным для моладзі і жанчын.

На трэць мяркуюць павялічыць колькасць працоўных месцаў установы адукацыі рэгіёна. Не хапае педагогаў і выхавальнікаў дашкольнай адукацыі. А вось, ці ўдасца запоўніць вакансіі?

— Многія наймальнікі занепакоены праблемай якасці спецыялістаў, — адзначыў **начальнік упраўлення дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва абласнога камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Аляксандр СОБАЛЬ.** — Але разам з тым нізкі ўзровень заработнай платы не матывуе прэтэндэнтаў на набыцце і паглыбленне прафесійных ведаў. А навучальныя ўстановы арыентуюць на тэарэтычныя і агульныя веды. Вось і прыходзіцца наймальнікам вучыць маладых спецыялістаў пасля ВНУ і каледжаў. А «вузкіх», унікальных спецыялістаў па-ранейшаму не хапае.

Праўда, многія арганізацыі плануюць сёлета павялічыць заработную плату сваім супрацоўнікам. Такія планы маюць да 80 % наймальнікаў.

### Інтэграцыя для беспрацоўных — набыць спецыяльнасць

Многія наймальнікі зацікаўлены ў павышэнні кваліфікацыі работнікаў і гатовы за свае сродкі заняцца перападрыхтоўкай. Тым больш што сярод беспрацоўных — у асноўным мужчыны працаздольнага ўзросту, якім крыху больш за 40. А вось моладзь з'яўляецца адной з самых пацярпелых на рынку працы. Летась кожны чацвёрты з біржы працы быў ва ўзросце да 30 гадоў. Чакаецца, што з ростам попыту эканомікі на кадры шанцы ў моладзі вырастуць.

Па словах Аляксандра Собаля, многія наймальнікі змянілі свой падыход да пошуку кадраў і шукаюць вопытных і разнапланавых работнікаў. Сёння запатрабаваны спецыялісты з творчым і крэатыўным падыходам да працы. Цяпер важна валодаць інфармацыйнымі тэхналогіямі, камунікатыўнымі навыкамі, замежнай мовай. Такіх работнікаў ва ўмовах канкурэнцыі на працоўную сілу знаходзіць усё цяжэй. Але і тыя, хто мае запатрабаваную спецыяльнасць, не павінны сядзець на месцы, а імкнуцца паглыбляць свае веды, цікавіцца інавацыямі ў сваёй сферы дзейнасці, заўважае Аляксандр Собаль. Кіраўнік аддасць перавагу кампетэнтнаму работніку.

Многія беспрацоўныя імкнуцца атрымаць новую спецыяльнасць. Плануецца накіраваць на перападрыхтоўку каля 1,4 тысячы беспрацоўных. А ўсяго плануецца працаўладкаваць у вобласці больш за 22 тысячы чалавек. Згодна з прагнозам, узровень беспрацоўя да 2019 года не перавысіць 0,7 % эканамічна актыўнага насельніцтва. Зараз гэты паказчык складае 0,6 %.

**У тэму:** КДК Гродзенскай вобласці ў ходзе праверкі некаторых раёнаў установілі факты неэфектыўнага выкарыстання сродкаў, якія выдзяляюцца на перападрыхтоўку беспрацоўных. Напрыклад, прадаўца адпраўляюць перавучвацца на швачку, а швачку — на прадаўца. У гэтым выпадку можна проста палепшыць падрыхтоўку гатовых спецыялістаў. Па словах супрацоўнікаў дзяржкантролю, гэта адбываецца, каб своечасова асвоіць сродкі. Такі падыход нельга назваць эфектыўным, ён сведчыць аб слабым вывучэнні рынку працы і патрэб раёна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

■ Нельга забыць

# Росіцкі рэквіем

**Кажуць, што час — найлепшы доктар, ён рана ці позна лечыць раненыя душы, гоіць самую балючую рану, няхай супакаенне! Але нават доўгія гады і тыя не здольныя суцешыць. І доказ гэтаму — памяць пра Асвейскую трагедыю: семдзесят пяць гадоў мінула, як яна адбылася, а думкі зноў і зноў варушаць пачуццё крыўды, розум па-ранейшаму не згаджаецца ўспрыняць жахлівую рэчаіснасць і тысячы безабаронных ахвяр. Росіцкі рэквіем яшчэ раз ускалыхнуў памяць пра нялюдскую вайну супраць чалавецтва.**















Бяда здарылася 16 лютага 1943 года. У гэты дзень фашысты пачалі карную аперацыю супраць мірнага насельніцтва на тэрыторыі Асвейскага, Дрысенскага, Расонскага і Полацкага раёнаў пад назвай «Зімовае чараўніцтва». Гітлераўскія паслугачы сагналі ў мясцовы касцёл жыхароў Росіцы і навакольных вёсак і, пратрымаўшы некалькі дзён, вывелі на ўскраіну і жывцом спалілі ў вялікім гумне. У той дзень загінулі 1528 чалавек. Сярод забітых былі два каталіцкія святары — ксяндзы Антоній Ляшчэвіч і Юрый Кашыра. Да апошняй хвіліны яны заставаліся ў храме разам з парафіянамі, праводзілі бесперапынную малітву за выратаванне і не пакінулі вернікаў нават у момант смерці.

Сёлета некалькі соцень вернікаў сабраліся на пакутнае месца, каб у супольнай малітве і ў тым самым касцёле, які падчас трагедыі быў канцэнтрацыйнай зонай, маліцца за росіцкіх пакутнікаў, у жалобнай працэсіі прайсці дарогай, па якой апошні раз ішлі безабаронныя людзі. Каб ускласці кветкі і паставіць лампадкі каля крыжа, які ўзвышаецца на месцы спаленага з людзьмі гумна. Узначаліў памятную працэсію біскуп Віцебскай дыяцэзіі Алег Буткевіч разам з пробашчам Чэславам Курэчкам — лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне», і многімі святарамі касцёлаў Віцебшчыны.

Гісторыя сведчыць: трагедыя Асвейшчыны — адна з самых жудасных старонак вайны на тэрыторыі Беларусі. Аперацыя нацыстаў па жорсткасці пераўзышла ўсе праведзеныя да гэтага акцыі па знішчэнні мірнага насельніцтва. У выніку блакады, а доўжылася яна амаль паўтара месяца, толькі ў колішнім Асвейскім раёне былі спалены ўсе 158 населеных пунктаў, частка з якіх знішчана разам з людзьмі. З дваццаць адной тысячы на папялішчы вярнулася толькі шэсць з паловаю тысяч колішніх жыхароў.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
*Верхнядзвінскі раён, вёска Росіца.*

**Поўную версію фотарэпартажу глядзіце на партале www.zviazda.by**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ГЭТА НЕ ГУЛЬНЯ

**У Мінску адбыўся прэм'ерны паказ мастацкага фільма «Не гульня». Ён быў створаны на нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» спецыяльна да 100-годдзя Узброеных Сіл Беларусі па заказе Міністэрства культуры пры ўдзеле Міністэрства абароны.**

Стужка расказвае пра сучасную армію вачыма маладога праграміста, які пайшоў туды для таго, каб болей даведацца пра баявую тэхніку і парадак, які пануе ў войску. Але паступова малады чалавек перагледзеў усё сваё жыццё...

— Фільм паказвае тое, як маладыя людзі ва Узброеных Сілах становяцца сапраўднымі грамадзянамі сваёй краіны, — зазначыў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.** — Як юнакі выкоўваюць свой характар, разважаюць над сваімі арыенцірамі. Хлопцы, якія прыйшлі з усіх куткоў краіны, пакрысе спайваюцца ў магутны калектыў, здольны адстаяць краіну.

У сваю чаргу **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА** растлумачыла назву стужкі.

— Армія — гэта школа сталення, мужнасці для тысяч юнакоў. І за гэты час яны пераконваюцца, што рэальнае жыццё — гэта не камп'ютарная гульня, дзе ўсё можна ў любы момант пачаць нанова...

Здымкі стужкі праходзілі ў Мінску, на «Лініі Сталіна», Кургане Славы і ў Пячах. Але перад пачаткам прэм'ернага паказу разгарнулася мабільная выстаўка ўзбраення. Тыя, хто хацеў праверыць, наколькі ён трапны, маглі папрактыкавацца на трэнажорах, якія выкарыстоўваюцца для навучання абыходжанню са стралковай зброяй і гранатамётамі. І, вядома ж, можна было пабачыць сапраўдныя снайперскія вінтоўкі і пісталеты-кулямёты.

## ПАТРЫЯТЫЗМ ПАЧЫНАЕЦЦА СА ШКОЛЫ

**Многія школы Беларусі маюць свае музеі. Зараз іх налічваецца крыху менш за паўтары тысячы. 230 з іх адносяцца да ваенна-гістарычнага профілю. Аднак дагэтуль няма адзінага зборніка школьных музеяў. Зрэшты, гэтую хібу плануюць выправіць.**

— Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства зараз фарміруе банк даных гэтых музеяў, — паведаміла **кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК.** — Праца — каласальная. Але разам з тым яна мае значны выхаваўчы патэнцыял. За дзесяцігоддзі ў гэтых музеях быў сабраны велізарны пласт ваенна-гістарычнай спадчыны нашай краіны.

Асабліва гэта важна ў кантэксце патрыятычнага выхавання вучняў, бо праз некалькі гадоў ім будзе даверана місія падтрымання міру ў Беларусі.

— У нашай краіне зроблена вельмі шмат для ваеннай бяспекі, — зазначыў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны палкоўнік Уладзімір МАКАРАЎ.** — Але задач, якія стаяць перад намі, па-ранейшаму шмат. Чалавек, які любіць і гатовы ахоўваць Радзіму, ёсць на любой працы. Таму, напрыклад, патрыёт-настаўнік не менш значны за патрыёта-вайскоўца. А сучасны патрыёт мусіць быць годным гісторыі сваёй краіны.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## НАТАРЫУСЫ — СУПРАЦОЎНІКАМ І ВЕТЭРАНАМ МІЛІЦЫІ

**Мінская гарадская натарыяльная палата сумесна з галоўным упраўленнем унутраных спраў Мінгарвыканкама арганізуюць акцыю, прымеркаваную да Дня беларускай міліцыі. Падчас яе натарыусы Мінскай гарадской натарыяльнай акругі бясплатна пракансультуюць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і ветэранаў міліцыі 2 сакавіка.**

Удзел у акцыі па бясплатным прававым кансультаванні прымуць усе натарыяльныя канторы і натарыяльныя бюро Мінска. На працягу працоўнага дня 2 сакавіка супрацоўнікі АУС і ветэраны міліцыі змогуць атрымаць кансультацыю натарыуса па любых пытаннях, звязаных са здзяйсненнем натарыяльных дзеянняў. Для атрымання кансультацыі ахвотныя могуць папярэдне запісацца на прыём да натарыуса, паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама.

Час работы, адрасы і тэлефоны натарыяльных кантор і натарыяльных бюро Мінска можна ўдакладніць на афіцыйным сайце Беларускай натарыяльнай палаты http://belnotary.by/ у раздзеле «Знайсці натарыуса».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой»

**извещает своих акционеров о проведении очередного общего (годового) собрания акционеров 29 марта 2018 года**

Место проведения собрания: Минский район, п. Ратомка, ул. Заславская, 8а, актовый зал.

Начало работы собрания: 12.00.

Регистрация участников собрания: с 10.00 до 11.40.

Собрание проводится в очной форме.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ**

*1. Об утверждении годового отчета Общества за 2017 год.*

*2. О рассмотрении заключения ревизионной комиссии о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год.*

*3. О рассмотрении аудиторского заключения по годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2017 год.*

*4. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2017 год.*

*5. О распределении чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2017 год и направлениях использования чистой прибыли на 2018 год.*

*6. О выплате дивидендов в 2018 году.*

*7. Об избрании членов наблюдательного совета Общества.*

*8. Об избрании членов ревизионной комиссии Общества.*

*9. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 20 по 28 марта 2018 года, по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1 (кабинет главного бухгалтера) с 14.00 до 15.00, либо в день проведения собрания 29 марта 2018 года – по месту его проведения.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров – 12 марта 2018 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, оформленную в установленном порядке.

УНП 100068131

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта | Право заключения договора аренды сроком 5 лет части помещения площадью 1,0 кв. м по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37 (2-й этаж блока «А») |
| Начальная цена продажи | 3,80 руб. (три рубля восемьдесят копеек) с учетом НДС |
| Размер ежемесячной арендной платы | 3 (три) базовых арендных величины |
| Сумма задатка | 0,38 руб. (тридцать восемь копеек) |
| Условия аукциона | Целевое назначение арендуемых площадей – размещение вендингового аппарата, кран-машины (автомат для мягкой игрушки «Осьминожка») |
| Продавец | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8 0152 73-43-52, факс 8 0152 72-24-58 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | Срок оплаты – 7 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды) |
| Срок заключения договора аренды | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 30 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

– заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

– *юридическим лицом резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

– *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

– *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

– представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

– физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

– представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 26 марта 2018 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

**Отчет по использованию Местным благотворительным фондом «Дать Надежду» своего имущества за 2017 г.**

Местный благотворительный фонд был зарегистрирован в мае 2017 г.

Стоимость имущества фонда за 2017 г. – 21 437 руб. 49 коп., в том числе уставной фонд – 2 300 руб.

Сумма расходов на достижение уставных целей – 16 531 руб. 04 коп.

Сумма расходов на административно-хозяйственную деятельность – 2793 р. 67 коп.

Предпринимательскую деятельность фонд не осуществляет. Унитарных предприятий, хозяйственных обществ фондом не создавалось и в таких юридических лицах фонд не участвует.

УНП 790613339

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества**

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

**Продавец:** транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги» (Витебская дистанция гражданских сооружений), г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212) 37-81-85

**Лот № 1.** Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 222,0 кв. м, расположенного на 1-м этаже капитального строения (административное здание (хозяйственный блок СПК) с инв. № 200/С-54277 по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, 4 для размещения станции технического обслуживания и диагностики автомобилей, офисные помещения. Ежемесячный размер арендной платы – 26,64 базовые арендные величины. **Начальная цена**: 843,60 руб. **Задаток:** 84,36 руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 14.03.2018 в 10.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 27.02.2018 с 8.30. по 13.03.2018 до 17.30

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049. Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. В случае если торги в форме аукциона признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. **Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 05.05.2017, 28.06.2017, 17.08.2017, 27.10.2017, 26.12.2017, 25.01.2018. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. С полной информацией о порядке проведения торгов, оформления участия и определения победителя аукциона можно ознакомиться на сайте www.marketvit.by. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63

***Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»***

**23 марта 2018 года**

состоится очередное общее собрание акционеров

**ОАО «Рапс»,**

расположенного по адресу: Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20.

*Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал*

**Повестка дня собрания:**

1. Отчет о работе наблюдательного совета в 2017 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году и основных направлениях деятельности Общества на 2018 год.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2017 год. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2018 год и 1-й квартал 2019 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О предоставлении структурному подразделению облисполкома, уполномоченному в проведении анализа эффективности деятельности организаций, сведений и документов хозяйственного общества в 2018–2019 годах.

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, с 12 марта 2018 по 22 марта 2018 года (время работы с 14.00 до 16.00) в кабинете бухгалтерии либо 23 марта 2018 г. по месту проведения собрания.*

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 23 марта 2018 г. в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 2 марта 2018 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!**

*Справки по тел.: 8 (017) 506-94-14, 8 (017) 506-92-11*

УНП 600068480

**Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!**

**Собрание акционеров состоится 30 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17 в актовом зале.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Отчет об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2017 год и основных направлениях деятельности в 2018 году.
2. Отчет ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2017 год.
3. Отчет наблюдательного совета общества о проделанной работе в 2017 году.
4. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2017 год.
5. О распределении прибыли и убытков.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об определении размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О внесении изменений в устав ОАО «Белгорхимпром».

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Киселева, 26а, приемная генерального директора) в рабочие дни в период с 12 по 29 марта 2018 г. с 13.00 до 15.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании – в день проведения собрания **с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 17, в актовом зале (3-й этаж).** При себе иметь следующие документы: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 600024712

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **29 марта 2018 г**., **начало – 09.00, окончание – 17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: ООО «Белинтертранс» (УНП 600050171) в лице антикризисного управляющего ООО «Управляющая компания «СОВЕТНИК».

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Шаг торгов, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автобус МАЗ 256270, 2007 г. в., рег. знак АЕ 1927-5 | 10 810,00 | 540,50 | 1 081,00 |
| 2 | Автобус МАЗ 256270, 2007 г. в., рег. знак АН 0630-5 | 10 810,00 | 540,50 | 1 081,00 |
| 3 | Автомобиль грузовой седельный тягач «Скания» R420, 2008 г. в., рег. знак АЕ 7216-5 | 21 530,00 | 1 076,50 | 2 153,00 |
| 4 | Автомобиль грузовой фургон изотермический МАЗ-437130 с кузовом «Купава», 2011 г. в., рег. знак AI 7780-5 | 7 040,00 | 352,00 | 704,00 |
| 5 | Автомобиль грузовой фургон изотермический МАЗ-437130 с кузовом «Купава», 2011 г. в., рег. знак АК 7044-5 | 7 040,00 | 352,00 | 704,00 |
| 6 | Автомобиль грузовой фургон изотермический МАЗ-437130 с кузовом «Купава», 2011 г. в., рег. знак АК 7724-5 | 7 040,00 | 352,00 | 704,00 |
| 7 | Автомобиль грузовой специальный самосвал МАЗ-551605 (271), 2012 г. в., рег. знак АМ 0281-5 | 15 520,00 | 776,00 | 1 552,00 |
| 8 | Автомобиль грузовой специальный самосвал МАЗ-551605 (271), 2012 г. в., рег. знак АМ 0284-5 | 15 520,00 | 776,00 | 1 552,00 |
| 9 | Полуприцеп бортовой тентовый Schmitz Cargobull S01, 2008 г. в., рег. знак А 7564 А-5 | 6 750,00 | 337,50 | 675,00 |
| 10 | Полуприцеп бортовой тентовый Schmitz Cargobull SPR24L, 2008 г. в., рег. знак А 5037 А-5 | 6 750,00 | 337,50 | 675,00 |
| 11 | Полуприцеп бортовой тентовый «Кегель» SN24, 2008 г. в., рег. знак А 7746 А-5 | 7 390,00 | 369,50 | 739,00 |
| 12 | Полуприцеп бортовой тентовый «Кегель» SN24, 2010 г. в., рег. знак А 7768 А-5 | 8 680,00 | 434,00 | 868,00 |
| 13 | Полуприцеп бортовой тентовый «Кегель» SN24, 2010 г. в., рег. знак А 7775 А-5 | 8 680,00 | 434,00 | 868,00 |
| 14 | Полуприцеп бортовой тентовый «Кегель» SN24, 2010 г. в., рег. знак А 7779 А-5, рама № WK0S0002400133513 | 8 680,00 | 434,00 | 868,00 |
| 15 | Полуприцеп бортовой тентовый «Кегель» SN24, 2010 г. в., рег. знак А 7789 А-5 | 8 680,00 | 434,00 | 868,00 |
| 16 | Полуприцеп бортовой тентовый «Кегель» SN24, 2008 г. в., рег. знак А 7790 А-5 | 8 680,00 | 434,00 | 868,00 |
| 17 | Полуприцеп бортовой тентовый «Кегель» SN24, 2010 г. в., рег. знак А 7771 А-5 | 10 416,00 | 520,80 | 1 041,60 |

Местонахождение лотов – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, телефон для ознакомления +37529 698-53-04.

**Для участия в торгах необходимо:**

в срок по **27 марта 2018 г.** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»;

далее подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELTORGI.BY**;

направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте **WWW.BELTORGI.BY**).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. В ходе электронных торгов любой допущенный к торгам участник имеет право на новое ценовое предложение (далее – ставка) посредством его повышения на установленный в объявлении шаг. Все ставки участников и время их поступления располагаются в открытом доступе для участников электронной площадки. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения на основании представленного организатором торгов извещения о возмещении затрат. После этого между продавцом и победителем электронных торгов в течение десяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи предмета торгов

## Уважаемые акционеры ОАО «Белкотлоочистка»!

**Очередное собрание акционеров состоится 28 марта 2018 года, начало собрания 10.00, место проведения – г. Минск, ул. Аранская, 22а. Регистрация проводится с 9.00 до 9.45 (при себе иметь паспорт)**

**Повестка дня**

1. Об итогах работы общества в 2017 г. и задачах на 2018 г.
2. Утверждение бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2017 г., определение порядка выплаты дивидендов.
3. О направлении использования прибыли в 2018 году
4. Отчет наблюдательного совета и ревизионной комиссии о работе за 2017 г.
5. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Создание дочернего (совместного) предприятия.

Тел. для справок (017) 298-27-57.

УНП 100071353

**ОТЧЕТ**

**Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» об использовании своего имущества за 2017 год**

Количество учредителей Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» – 4, из них 3 – физические лица.

Информация о стоимости имущества Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» (далее – Фонд):

стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 2045 белорусских рублей 00 копеек в деноминированных единицах;

поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с уставом Фонда (целевое финансирование), составляют 69 382 белорусских рубля 96 копеек;

поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 753 белорусских рубля 33 копейки.

Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе Фонда, составила 30 208 белорусских рублей 59 копеек.

Фонд не имеет филиалов.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

Директор Е. Ф. Молочко

Бухгалтер Е. Я. Ходот

УНП 490912965

■ Чалавек – чалавеку

# ПА СПРАВЯДЛІВАСЦІ

**Не вам казаць: шмат хто па маладосці рвецца ў гарады, шмат хто пад старасць імкнецца назад у вёскі — бліжэй да прыроды, да зямлі. Вось і мае калегі Яўген Пятровіч і Вольга Іванаўна пабудавалі сабе дачу.**

Хацінка ў іх атрымалася што трэба — не горш, чым у іншых, але ж хацелася, каб пры ёй была яшчэ і лазенька, хоць і невялічкая, але свая.

Патроху сабралі грошай, нанялі майстроў. І вось яна, ужо гатовенькая: і самі костачкі парылі, і суседзям не адмаўлялі.

Нічога не скажаш, і з людзьмі, і між сабой яны добра жылі. Але ж...

Прычапілася да Вольгі Іванаўны цяжкая хвароба, абарвала яе жыццё.

Пятровіч тады вельмі гараваў, ніяк не мог змірыцца, слабеў.

Сын угаварваў яго прадаць і кватэру, і дачу, пераехаць да яго, але бацька ўсё ніяк не згаджаўся, усё корпаўся на сваёй фазэндзе, адзін, таму гародчык яго ўсё роўна зарастаў — «амерыканкай», бярозкай ды іншай трасцай...

Змогся Яўген Пятровіч, уцёк у горад, на фазэнду з тыдзень не прыязджаў, а з'явіўся — і вачам не паверыў, бо грады былі... у поўным парадку: пустазелле сохла на мяжы.

Гаспадар з той радасці памкнуўся быў да суседзяў, каб ім падзякаваць, але тыя сказалі, што яны ні пры чым. «Тады хто ж?» — думаў гаспадар.

...Даведаўся пра гэта ён значна пазней — калі сустрэў былую вучаніцу. У яе, як аказалася, таксама дача, зусім непадалёк... І калі да яе дайшла пагалоска, што Яўген Пятровіч аўдавеў і гарод зарос, яна ўсё зразумела...

Мой калега тады вельмі расчуліўся. Казаў, што першы раз у жыцці пашкадаваў, што быў... справядлівым, што ставіў гэтай дзяўчынцы двойкі.

І ў той жа час ён радаваўся, што па жыцці гэта вучаніца ідзе правільнай дарогай, што крыўды на яго не трымала і не трымае, што пра двойкі нават не ўспомніла.

**Іван Сувалаў,**

*г. Гомель*

■ Пытальнік

# ЯК НАРЫХТАВАЦЬ БУРАЛОМНУЮ ДРАЎНІНУ?

## По ордары і на платнай аснове

*Неаднойчы заўважаў: вось жа талент у карэспандэнтаў «Звязды». Толькі два словы скажы — артыкул напішуць, які і пачытаць цікава. Напрыклад, як Сяргей Расолька ў газеце ад 12 студзеня «Хто ў лес і хто — па дровы?» Гэта тэма-праблема мне вельмі добра вядома, ажно да салёнага поту, ламоты ў касцях і мазалёў...*

*Сёння ў мяне ёсць прафесійная бензапіла «шведка», ёсць трактар, а дровы выпісаць у лягасе складаней. Большая іх частка адтуль забіраецца на патрэбы ЖКГ і палівазбытам на тыя нармаваныя 4,9 кубаметра ў асноўным для жыхароў гарадскога пасёлка. Вырашаць пытанне дроў лепей загадзя — не ў сезон. Сёння мне яны абыдуцца, калі выпісваць у мясцовым лясніцтве, ад 195 да 282 рублёў. За транспарціроўку, рэзку, колку да гэтай сумы дададзім яшчэ 140—150 рублёў (калі ўсё гэта буду выконваць сам). Калі наймаць іншых работнікаў — будзе даражэй. І варыянт нарыхтоўкі пад заказ ад прадпрымальнікаў цуркамі на сезон. Адзін прычэп — пяць кубаметраў — будзе каштаваць 130—140 рублёў. Памнажаем на маю патрэбу ў пяць разоў, атрымліваем 650—700 рублёў. А гэта больш за дзве пенсіі. Яшчэ іх трэба пакалоць, скласці ў дрывотню. Дык гары яны гарам, гэтыя дровы!..*

*Сяргей Расолька ў артыкуле абмінуў адну праблему, за якую мне, як сапраўднаму гаспадару, баліць душа. Ён закрануў магчымасць нарыхтоўкі дроў праз выпіску дзялянкі, што адносна танна. А колькі «наламаных» дроў гніе? Гэта ўздоўж дарог у лесе бачыцца бы наведзены парадак. Зазірніце на 200—300—400 метраў глыбей у лес. Аніякія дзялянкі выпісваць не трэба! Выпішыце людзям гэтыя нахрыстаныя ўздоўж і ўпоперак (яшчэ добра, прыдатныя для нарыхтоўкі дроў) бярозы-вольхі-сасонкі! Няхай іх прыбяруць дбайныя гаспадары і будзе ў лесе больш парадку і, адпаведна, прыгажосці. Ды дзе там!..*

**Аляксандр Іванавіч МАТОШКА,**
**вёска Янкавічы Расонскага раёна.**

Дзякуй чытачу за добрыя словы на адрас аўтара. Насамрэч, калі ты нешта ўмееш рабіць уласнымі рукамі і перажываеш за справу, то і напісаць пра гэта не цяжка. Менавіта тое ж адчуваецца і ў лісце Аляксандра Іванавіча ў рэдакцыю — куды больш вялікім па аб'ёме (і эмацыянальнасці), чым мы маглі змясціць. Але сутнасць пытання зразумелая, шукаем адказ, у чым нам дапамаглі спецыялісты Міністэрства лясной гаспадаркі.



«Нарыхтоўка дроў, а таксама буралломнай, сухастойнай, пашкоджанай драўніны ў выніку буралomаў і да т. п. фізічнымі асобамі ў лясах ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Лясным кодэксам Рэспублікі Беларусь (далей — Лясны кодэкс) на падставе ордара.

У адпаведнасці з заканадаўствам, асноўным прынцыпам лесакарыстання з'яўляецца яго платнасць (артыкул 8 Ляснога кодэкса).

Плата за драўніну, адпушчаную на пні пры саманарыхтоўцы дроў, нязначная. Так, драўніна, адпушчаная на пні для нарыхтоўкі дроў насельніцтвам, рэалізуецца па таксавым кошце, які ў залежнасці ад пароды дрэў і лесатаксавага разраду складае 7—18 капеек за адзін кубічны метр.

У адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 41 Ляснога кодэкса, выдзеленне ўчасткаў ляснога фонду для нарыхтоўкі драўніны ажыццяўляецца юрыдычнымі асобамі, якія вядуць лясную гаспадарку (лясгасамі), іх структурнымі падраздзяленнямі (лясніцтвамі) у адпаведнасці з лесаўпарадкавальным праектам у парадку, устаноўленым артыкулам 42 Ляснога кодэкса. Згодна з часткай трэцяй пункта 1 артыкула 44 Ляснога кодэкса, нарыхтоўка драўніны на ўчастках ляснога фонду грамадзянамі ажыццяўляецца за плату на падставе ордара ў аб'ёме не больш за 50 кубічных метраў.

Адпаведна, грамадзяне, якія жадаюць атрымаць участак ляснога фонду для лесакарыстання, накіроўваюць лясніцтву, у распараджэнні якога знаходзіцца ўчастак ляснога фонду, пісьмовую заяву аб яго выдзяленні, у якім прыводзяцца: мэта атрымання ўчастка ляснога фонду; прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), месца жыхарства грамадзяніна; плануемыя да ажыццяўлення на запытаным участку віды лесакарыстання, аб'ём плануемых да нарыхтоўкі, збору, адабрання, выкарыстання лясных рэсурсаў і тэрмін, на які просіцца ўчастак ляснога фонду.

Лясніцтвы ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах, разглядаюць заяву і прыкладзеныя да яго матэрыялы і пры адсутнасці падстаў для адмовы ў выдзяленні ўчастка ляснога фонду для лесакарыстання выдзяляюць участак шляхам афармлення і выдачы ордара заяўніку пасля ўнясення ім платы за лесакарыстанне.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 года № 200 «Аб адміністрацыйных працэдурах, што ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян», выдача грамадзяніну ордара для нарыхтоўкі дроў ажыццяўляецца на працягу двух дзён з дня падачы заявы грамадзяніна ў лясніцтва пры ўмове прадстаўлення дакумента, што пацвярджае ўнясенне платы за драўніну, якая адпускаецца на пні. Рэкамендуем загадзя па тэлефоне ўзгадніць з лясніцтвам магчымасць і месца нарыхтоўкі дроў на пні, іх пародны састаў і аб'ём для вызначэння велічыні аплаты за неабходную драўніну».

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Сацыяльная кансультацыя

# Ці будзе праца ў 90-я гады залічаная ў стаж?

**У рэдакцыю нярэдка звяртаюцца чытачы з пытаннямі, што датычацца прызначэння пенсій. Вось і ў Алы Міхальчук з Мінска аказалася даволі тыповае пытанне пра стаж, якое, на нашу думку, будзе актуальнае і для многіх іншых чытачоў: «Я працавала ў 90-х гадах у фірме, якая на цяперашні момант ужо не існуе, пры гэтым дакументы ў архіў не здадзены. Запіс у працоўнай кніжцы маецца. Як гэта паўплывае на пенсію? Ці трэба даказваць свой працоўны стаж? І калі трэба, то як?»**

**Па адказ мы звярнуліся ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і атрымалі яго ад начальніка ўпраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння Галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Алены ДРОНАВАЙ:**

— Усё залежыць ад таго, у які перыяд мела месца гэтая работа, — паведаміла нам спецыяліст міністэрства. — Калі ваша чытачка працавала ў гэтай фірме да 1 ліпеня 1998 года і калі ў працоўнай кніжцы маецца належным чынам аформлены запіс аб рабоце, значыць, пры вылічэнні пенсіі гэтая работа будзе ўключана ў стаж без якіх-небудзь дадатковых умоў.

Але калі чалавек хоча, каб зарплата за гэты перыяд улічвалася пры вылічэнні памеру пенсіі, але пры гэтым у яго няма магчымасці запатрабаваць даведку аб заробку, то ўстанавіць памер зарплаты магчыма ў судовым парадку. Для гэтага неабходна звярнуцца ў суд. Але трэба быць гатовым прад'явіць нейкія доказы. Можа быць, у чалавека захаваліся разліковыя лісткі або карашкі, якія сведчаць аб налічанай зарплаце. Часам атрымліваецца знайсці штатны расклад у архіве... Магчыма, нехта з калег, хто працаваў побач у той час, паспеў узяць даведкі пра свой заробак, альбо гэта могуць быць звесткі з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва аб памеры фонду аплаты працы і штатнай колькасці работнікаў прадпрыемства... Толькі ўлічыце, што статыстычныя даныя аб сярэднай заработнай плаце работнікаў у краіне не з'яўляюцца велічынёй, якая пацвярджае персанальны заробак работніка.

Калі даказаць памер свайго заробку не атрымаецца, значыць, за гэтыя гады заробак будзе ўключаны з нулявым значэннем.

Калі ж чалавек працаваў у гэтай фірме ў перыяд пасля 1 ліпеня 1998 года, стаж працы будзе залічаны толькі пры ўмове, калі будзе прадстаўлены дакумент аб выплаце абавязковых страхавых унёскаў і аб заробку. Аднаго толькі запісу ў працоўнай кніжцы ў гэтым выпадку будзе недастаткова, абавязкова павінны быць прааналізаваныя і даходы за гэты перыяд. І тут зноў можна звяртацца ў суд. Наогул, у гэтым выпадку звесткі аб даходах патрэбныя не толькі для падліку памеру пенсіі, але і для вылічэння працоўнага стажу.

Дата 1 ліпеня 1998 года фігуруе нездарма. З гэтага дня былі ўнесены змяненні ў арт. 51 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», у адпаведнасці з якім вылічаецца стаж для прызначэння пенсій, якія прадугледжваюць, што ў стаж уключаюцца перыяды работы, на працягу якіх ажыццяўлялася выплата абавязковых страхавых унёскаў. Да гэтай даты, і ў тым ліку ў перыяд СССР, у стаж уключаліся перыяды работы, калі чалавек проста падлягаў дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню.

Што датычыцца пацвярджэння стажу працы і заробку на тэрыторыі нашай краіны з 1 студзеня 2003 года, то яны пацвярджаюцца на падставе звестак індывідуальнага (персаніфікаванага) уліку.

**Запісала Святлана БУСЬКО**

■ Літаратурныя вандроўкі

# НЯПЭЎНАЯ СЛАВА ВІНЦЭНТА

**Не так даўно споўнілася 210 гадоў з часу нараджэння першага класіка новай беларускай літаратуры — Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Частку свайго жыцця ён калісьці правёў у Валожынскім раёне, а дакладней у вёсцы Люцынка, дзе быў дом яго сям'і. Ці памятаюць сёння на малой радзіме гэтага знакамітага для беларускай гісторыі творцу? Ці захоўваюць тамтэйшыя мясціны матэрыяльныя згадкі пра яго? На Валожыншчыне, у пошуках слядоў і звестак пра Дуніна-Марцінкевіча, мы павандравалі разам з гісторыкам Алесем БЕЛЫМ.**

### Асабістае жыццё

Гісторыя яго асабістага жыцця нібы ствараліся для вадэвіля ці аперэты. Ён, настаўнік, закахаўся ў маладую дзяўчыну. Разам яны ўцякаюць з дому яе бацькоў... Людвіка Бараноўская, дачка значна больш заможных і ўплывовых бацькоў, і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, хатні настаўнік музыкі, закахаліся адно ў аднаго. Ён фактычна выкраў сваю маладую нявесту, таемна ўзяў з ёй шлюб.

Новая цешча, якая не лічыла законным такое сваяцтва, спрабавала аспрэчыць шлюб праз суд. Сам Марцінкевіч сцвярджаў, што ўсё было правільна, бо яго нявеста па законе з'яўлялася паўналетняй — згодна з касцельнай традыцыяй. У той час пісьменніку было дзесьці 22—23 гады, нявесце — 16.

Яе бацькі не лічылі такога жаніха ўдалай партыяй праз яго няпэўны матэрыяльны стан.

Разам маладыя пражылі дваццаць гадоў, пакуль Людвіка не памерла. Пасля яе смерці Вінцэнт ажаніўся яшчэ раз.



Алесь БЕЛЫ ў сядзібе «Марцінова Гусь».

Варта адзначыць, што Алесь Белы марыць, каб калі-небудзь у гэтай мясцовасці быў створаны мемарыяльны запаведнік класіка — накшталт пушкінскага Міхайлаўскага ў Расіі ці нашай купалаўскай Вязынкі.

## Дом Ядвігіна Ш. у Пяршаях

Ахвотным праехацца па мясцінах славутага драматурга гэтаксама, як і нам, можна пачаць з Пяршаяў. Гэта месца не наўпрост звязана з самім драматургам, аднак захоўвае некаторыя цікавыя згадкі. Дом колішняга лясніцтва, які стаіць і цяпер, раней адносіўся да фальварка роду Тышкевічаў. У ім аканомам быў бацька Ядвігіна Ш. (Антона Лявіцкага), таму сам пісьменнік правёў там частку жыцця. Гэта пабудова сярэдзіны XIX стагоддзя, якая і сёння застаецца ў даволі добрым стане.

Ядвігін Ш. у свой час наведваў падпольную школу Дуніна-Марцінкевіча, а па сутнасці патрыятычны гурток. Школа існавала некалькі гадоў, а пасля, у 1876 годзе, была выкрытая праз данос. Алесь Белы адзначае: відавочна, што ў доме Лявіцкіх Дунін-Марцінкевіч бываў не раз, бо ведаў бацьку Антона, Яна Лявіцкага. Да таго ж гэта месца ўсяго за 6-7 кіламетраў ад Люцынкі.

Дарэчы, некаторыя цікавыя экспанаты захоўваюцца ў мясцовай школе. Пэўныя рэчы былі знойдзены падчас раскопак самімі школьнікамі. На месцы былой сядзібы адшукалі некалькі керамічных і фаянсавых рэчаў.

## Люцынка і месца колішняй сядзібы

У вёсцы Люцынка, непадалёк ад Валожына, знаходзіцца сядзіба пад назвай «Марцінова Гусь». Там ёсць невялікі музейны куток, у якім захоўваюцца карціны з выявамі Дуніна-Марцінкевіча. Можна таксама ўбачыць фотаздымкі і інфармацыйныя шыльды, якія расказваюць пра жыццё і творчасць драматурга, асабліва пра перыяд, праведзены ў Люцынцы. Ёсць там звесткі і пра некаторых іншых каларытных асоб, ураджэнцаў гэтай мясцовасці.

Зусім непадалёк, за 500 метраў, знаходзіцца тое месца, дзе калісьці была сядзіба Марцінкевіча і яго нашчадкаў. Дом пісьменніка згарэў у 1890 ці 1891 годзе. Пасля пажару новы дом адбудавалі яго ўнукі Крыжаньскія. Там і сёння стаіць дубовы крыж, які адна з праўнучак паставіла па сваім дзедзе.

За савецкім часам у Люцынцы штогод адбываўся фэст народных тэатраў, там часта ставілі «Ідылію», «Пінскую шляхту», на што звяртае ўвагу Алесь Белы:

— Мне марыцца, каб на гары, дзе калісьці стаяла сядзіба Дуніна-Марцінкевіча, была абсталяваная пляцоўка. Там варта зрабіць хоць бы лавы, імправізаваную сцэну. Можна адрадзіць колішні тэатральны фестываль. Таксама добра было б праводзіць там пэўныя лекцыі пра Дуніна-Марцінкевіча, пра людзей, з якімі ён быў знаёмы, увогуле пра тую эпоху, пра мясцовасць... Варта часцей прывозіць сюды школьнікаў, іншых турыстаў. Многія проста не ўяўляюць, што ёсць такое месца — Люцынка, проста не ведаюць, дзе яна знаходзіцца.

## Могілкі ў Тупальшчыне

Наступны пункт нашай вандроўкі — могілкі ў Тупальшчыне, дзе знайшоў апошні спачын Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Акрамя драматурга, там пахаваны і некаторыя іншыя знакавыя асобы. Гэтае месца — досыць каларытнае і можа быць цікавым вандроўніку. Зусім нядаўна Алесь Белы на агароджу могілак прымацаваў падрабязны інфармацыйны мемарыяльны стэнд. З яго можна даведацца пра гісторыю не толькі могілак, але і былога фальварка Жаброўскіх, вакол прыватнай радавой капліцы якога яны і ўзніклі.

**Алесь Белы марыць, каб калі-небудзь у гэтай мясцовасці быў створаны мемарыяльны запаведнік класіка — накшталт пушкінскага Міхайлаўскага ў Расіі ці нашай купалаўскай Вязынкі.**

Стэнд быў усталяваны дзякуючы ініцыятыве «Развіццё інфраструктуры зялёнага маршруту «Валожынскія гасцінцы» ў Валожынскім раёне», які рэалізуецца спажывецкім кааператывам па развіцці аграэкатурызму «Валожынскія гасцінцы». Усё гэта адбываецца ў межах праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Беларусі», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН).

